7 ВЕРАСНЯ 1999г. АЎТОРАК

НАВІНЫ

№101 (632) КОШТ СВАБОДНЫ

стр.4

«КИНО ПРО ВОЛОСАТЫХ»

ЭКАНОМІКА

«Чаўночны» бунт

У рэспубліцы спынілі работу прыкладна 73% рынкаў

Рыгор БУЯН

Бунт прыватных прадпрымальнікаў, якіх у рэспубліцы налічваецца да 150 тысяч чалавек, набыў агульнарэспубліканскі маштаб. Да прыватнікаў з Гродна, Віцебска, Наваполацка, Полацка, іншых гарадоў далучылася фактычна ўся рэспубліка: ужо бастуюць каля 73% рынкаў па ўсёй Беларусі. Мінскія прадпрымальнікі таксама не выходзяць на працу, за выключэннем хіба што 10% гандляроў «Дынама».

Усеагульнае абурэнне гандляроў выклікаў прэзідэнцкі дэкрэт №14, падпісаны яшчэ 4 жніўня 1997 года. Менавіта гэты дакумент запатрабаваў ад прадпрымальнікаў праводзіць абавязковую сертыфікацыю ўсіх без выключэння тавараў. Пасля забастовак у траўні гэтага года ўлады пайшлі на перамовы з прыватнымі гандлярамі, у выніку якіх дзеянне дэкрэта было прыпыненае да 1 верасня. З 1 верасня дэкрэт двухгадовай даўнасці пачаў дзейнічаць на поўную сілу — з гэтага дня любы супрацоўнік праваахоўных органаў можа без суда і следства канфіскоўваць у гандляроў тавар, калі адсутнічаюць сертыфікат якасці, дакументы на пакупку валюты ці іншыя нейкія паперы. Прыватныя прадпрымальнікі сталі безабароннымі, менавіта таму ўжо 1 верасня частка прыватнікаў не выйшла на работу.

Прадпрымальніцкі бунт разрастаецца. Як адзначыў старшыня стачкама, утворанага прадпрымальнікамі, Валерый Леванеўскі, гандляры будуць пратэставаць да поўнай адмены дэкрэта. 3 верасня прадстаўнікі прадпрымальніцкіх прафсаюзаў перадалі свае патрабаванні ў адміністрацыю прэзідэнта і міністэрства прадпрымальніцтва і інвестыцыяў. Адказ трэба чакаць праз месяц — таму мінімум на месяц гандляры спынілі сваю працу. 6 верасня прадстаўнікі стачкама ў многіх гарадах і мястэчках падалі заяўкі ў органы мясцовай улады на правядзенне мітынгаў 20—26 верасня. Валерый Леванеўскі заявіў пра падтрымку з боку прадпрымальнікаў і акцыяў пратэсту афіцыйных прафсаюзаў, якія запланаваныя на 30 верасня ў Мінску і абласных гарадах.

Выступленне прадпрымальнікаў адзіным фронтам супраць дэкрэта №14 фактычна заклала асновы для стварэння Свабодных прафсаюзаў Беларускіх грамадзян-прадпрымальнікаў і асоб, якія працуюць на рынках РБ. Стачкам ужо абвясціў пра пачатак яго стварэння. Па словах В.Леванеўскага, больш за 20 прафсаюзаў з усёй рэспублікі выказалі жаданне аб'яднацца ў адзіную структуру, і прадпрымальнікі больш чым з 30 гарадоў і мястэчак саспелі для стварэння мясцовых прафсаюзаў. Кіраўніцтва стачкама плануе аб'яднаць беларускіх прадпрымальнікаў да сярэдзіны верасня. Усе гэта робіцца з адной мэтай — сумеснымі намаганнямі абараняць свае інтарэсы. ▶

Заканчэнне на стар.3

Пад грыфам «Звышсакрэтна»

Дыпламатам загадана любой цаной «закантачыць» з Еўропай

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

МЗС Беларусі распрацаваў план уступлення ў Савет Еўропы пасля правядзення ў Беларусі парламенцкіх выбараў. Асаблівая надзея ў выкананні гэтай, прама скажам, фантастычнай мэты ўскладаецца на рабочую групу пад кіраўніцтвам Міхаіла Сазонава, якой А.Лукашэнка даручыў праводзіць кансультацыі з палітычнымі партыямі. Копія гэтага закрытага дакумента трапіла ў НАВІНЫ.

Нагадаем, шмат хто ў Беларусі лічыць, што сапраўдная мэта групы Сазонава — не шукаць выйсця з канстытуцыйнага крызісу, а імітаваць працэс перамоваў, каб уцягнуць еўрапейскія структуры ў кантакты з афіцыйнымі прадстаўнікамі беларускай дзяржавы і тым самым падмацаваць імідж Лукашэнкі і ягоны статус (а з пункту гледжання міжнароднага права, пасля 20 ліпеня ён не прэзідэнт, а чалавек, які валодае дзяржаўнай уладай). Існуе меркаванне, што гэтай імітацыяй Лукашэнка таксама паспрабуе адцягнуць час, калі ў ягоную спрэчку з апазіцыяй умяшаецца галодны народ. Вось і ладзіцца «дыялог дзеля дыялогу». На карысць таго, што гэта менавіта «гаварыльня» і да яе інакш не ставяцца і ва ўладных калідорах, сведчаць многія з пунктаў плана, зацверджанага міністрам замежных справаў Уралам Латыпавым.

Калісьці так складаліся камсамольскія дакументы — шмат палітычнай траскатні і як мага больш узгадванняў начальніка. МЗСаўскі план «вяртання ў Еўропу» не пазбаўлены таго ж «дасягнення». Аўтары пералічваюць будучыя паездкі свайго шэфа за межу — у Нью-Йорк, Страсбург, Прагу, не пакідаюць без увагі і меншыя па маштабах падзеі — канферэнцыі з удзелам беларускіх прадстаўнікоў у Берліне. «Выкарыстоўваць візіт», «правесці», «інфармаваць» — такія інструкцыі раздаюцца тым, хто паедзе за мяжу, і тым, хто ўжо там.

Фота BF

● Міністр замежных справаў **Урал Латыпаў** пакуль што ў добрым настроі

Аб'ектам інфармацыйнай раскруткі павінна стаць рабочая група пад кіраўніцтвам Міхаіла Сазонава, а фонам для гэтай кампаніі — абстаноўка «палітычнай стабільнасці ў Беларусі, якая аказвае пазітыўны ўплыў на стабільнасць і прадказальнасць эканамічнай палітыкі Рэспублікі Беларусь» (п.5 плана). Аказваецца, пра наяўнасць гэтай «стабільнасці» трэба інфармаваць як мага больш людзей. Прычым не толькі замежнікаў, але і беларусаў (а то не ведаюць бедныя, як ім стабільна жывецца!). Навошта патрэбная гэтая палітінфармацыя сваёй і сусветнай грамадскасці? А каб «супрацьстаяць магчымаму тэндэнцыйнаму асвятленню падзеяў у Беларусі» — чытаем у 6-ым пункце латыпаўскага плана і далей знаходзім, каго ў першую чаргу будуць ратаваць ад «магчымага тэндэнцыйнага асвятлення». Гэта — кіраўнік дэлегацыі Еўрапарламента па сувязях з Беларуссю Ж.Н.Віерсма, дакладчык Парламенцкай асамблеі па Беларусі В.Берэндт і, канешне ж, кіраўнік Кансультатыўна-назіральнай групы АБСЕ Х.-Г.Вік і кіраўнік рабочай групы АП АБСЕ А.Северын. Паколькі ў працэс назірання за Беларуссю ўцягнуты куды больш шырокія еўрапейскія колы, план рэкамендуе «праводзіць рэгулярныя сустрэчы» таксама з паслом Францыі Б.Фасье, бо ён прадстаўляе ў Беларусі яшчэ і ўвесь Еўрапейскі саюз, а таксама з амбасадарам Германіі Х.Вінкельманам. ▶

Заканчэнне на стар.3

ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ

- **Былы кіраўнік парламента Азербайджана Расул Гулієў затрыманы два дні назад іміграцыйнай службай ЗША.** Гулієў жыве за мяжой з 1996 года. Каля двух гадоў назад супраць яго была ўзбуджаная крымінальная справа па абвінавачванні ў крадзяжы ў асабліва вялікіх памерах. Экс-спікер заявіў, што яго пераследуюць з-за таго, што ён крытыкуе прэзідэнта Азербайджана Гейдара Аліева і яго ачаленне.
- **У нядзелю на Манежнай плошчы Масквы адбылася масавая бойка з прымяненнем халоднай зброі.** У сутычцы ўдзельнічала каля 50-ці чалавек ва ўзросце ад 17 да 22 гадоў, «якія знаходзіліся ў стане моцнага алкагольнага ап'янення». 6 чалавек атрымалі нажавыя раненні, двое з іх цяжка параненыя.
- **Працягваюцца масавыя беспарадкі ва Усходнім Цімары.** Ужо загінула каля ста чалавек. Паранены лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру, епіскап-каталік Карлуш Белу. Эвакуяваныя амаль усе журналісты і супрацоўнікі ААН. Беспарадкі ва Усходнім Цімары — былой партугальскай калоніі, анэксаванай Інданезіяй у 70-ым годзе, — пачаліся пасля таго, як на рэферэндуме больш за 78% выбаршчыкаў выказаліся за незалежнасць.
- **Наш былы зямляк, а зараз гулец зборнай Расіі па гандболе Аляксандр Тучкін атрымаў сур'ёзныя траўмы ў выніку дарожна-транспартнага здарэння.** Тучкін у кампаніі расіяніна Ігара Лаўрова накіраваўся ў аўтамабільную паездку, якая закончылася трагічна, — машына не ўпісалася ў паварот і ўрэзалася ў дрэва. Абодвух спартсменаў чакае шматмесячнае лячэнне.

наша свабода

НАДВОР'Е

Віцебск +23-25
Магілёў +22-24
Мінск +22-24
Гродна +23-25
Гомель +20-23
Брэст +22-24

Сёння ўдзень па краіне чакаецца пераменная воблачнасць, без ападкаў, вецер няўстойлівы, 3—8 м/сек. У наступныя двое сутак, **8—9 верасня**, чакаецца пераменная воблачнасць, пераважна без ападкаў, толькі па поўдні краіны кароткачасовыя дажджы, тэмпература паветра ўначы 6—11 градусаў, удзень — 20—25.

Курс наяўнага долара на «чорным рынку»

485 000

АЎТОРАК з Кастусём ТАРАСАВЫМ

Культ сілы

Мінулы месяц расійскае ТБ па ўсіх каналах інфармавала расіянаў і, зразумела, сусветную тэлеаўдыторыю пра змаганне з «воінамі Алаха», «чачэнскім мітратворчым батальёнам» і ваххабітамі ў Дагестане. Бітва працягваецца і сёння, і канец неяк не прадбачыцца. На экране з'яўляліся вышэйшыя чыны сілавых міністэрстваў, былы і новы прэм'еры, прэзідэнт Ельцын, дагестанскія чыноўнікі. Найбольш дэманстравала расійская тэхніка: «грады», штурмавая авіяцыя, баявыя верталёты, якія абстрэльвалі пазіцыі баевікоў. Значную частку тэлеэфірнага часу займаў паказ расійскіх воінаў у працэсе мінамётнага, гарматнага, бомбавага і снайперскага абстрэлу сёлаў. Гэтакай агнявой моцы не часта збіралі на такой малой тэрыторыі нават падчас Вялікай Айчыннай вайны. «Аб'ёмных, ці вакуумных, бомбаў тады наогул не было. А зараз у баях з «бандфарміраваннямі» іх прадэманстравалі, праўда, сімвалічна — выбухам агню за нейкай гарой. Аднак патлумачылі, што гэтакая бомба пакідае ад усяго жывога цені на камянях. Дагестанскія добраахвотнікі ў баявых дзеяннях амаль не ўдзельнічаюць (праваднікі, адлоў уцекачоў па аўтобусах). Узброіць іх не спяшаюцца ці баяцца, бо потым узнікне пытанне, як іх раззброіць? Баявыя падраздзяленні унутраных войскаў перакідваюцца з Расіі, і адказ салдатаў і афіцэраў на пытанні журналістаў сведчаць пра «рускую нацыянальнасць» людзей, прысланых абараняць «канстытуцыйную прастору» і непадзельнае адзінства народаў РФ.

Такое адкрытае дэманстраванне ваеннай тэхнікі разлічана, відаць, на запужванне іншых радыкалаў. З беларускага пункту гледзішча, патрапіць у саюз з Расіяй зараз проста, а калі-небудзь выйсці з яго будзе немагчыма — бо адразу прыбудзе ўся тая тэхніка, якую скарыстоўваюць пры ўзяцці горных сёлаў. Па іроніі лёсу, некаторыя дэпутаты і Дзяржаўнай думы Расіі, і нашага Нацыянальнага сходу палымяна даказваюць, што амерыканскія фільмы прышчэпліваюць тэлегледачу культ гвалту. Але амерыканскія казкі пра «салдатаў удачы» не ідуць ні ў якое параўнанне з прышчэпліваннем культу сілы ў карцінах дагестанскай вайны, цынічнага абыходжання з затрыманымі, якіх, паклаўшы на зямлю, пытаюцца: «Ты за аддзяленне Дагестана ад Расіі?» А калі чалавек адкажа — «Так!», дык будзе вораг, варты турмы. Можа і ў нас стацца, што ўсіх, хто скажа, што ён супраць аб'яднання з Расіяй, пакладуць тварам у гразь і будуць пагражаць «стваллом», пакуль не пагодзішся адказаць: «Не, я за вечны Саюз! Гэта — святое!»

ФОТАФАКТ

4 сентября состоялось празднование Дня воинской славы и поминальный молебен по воинам, погибшим в Оршанской битве. В акции, проходившей на месте сражения, принимала участие рейдовая группа общественно-спортивной патриотической организации «Край»

Апазіцыя просіць разумення

Рыгор БУЯН

Прадстаўнікі беларускай апазіцыі прапануюць палітычнаму бамонду РФ платформу беларуска-расійскіх адносінаў.

Напярэдадні чарговага паседжання выканкама Саюза Беларусі і Расіі, запланаванага на 8 верасня ў Мінску, в.а. старшыні Вярхоўнага Савета Віктар Ганчар і старшыня Нацыянальнага выканаўчага камітэта Мечыслаў Грыб звярнуліся да палітычнага бамонду Расіі. Выказваючы заклапочанасць разыгрываннем «беларускай карты», якое «можна вытлумачыць толькі як хваравітае жаданне ўладароў дзвюх краінаў пашырыць і працягнуць сваю ўладу», беларускія апазіцыянеры прапануюць уласную платформу беларуска-расійскіх адносінаў. В.Ганчар і М.Грыб прапануюць партыйным лідэрам, кандыдатам у дэпутаты Дзярждумы і кандыдатам у прэзідэнты Расіі «Дэкларацыю прынцыпаў адносінаў паміж Беларуссю і Расіяй». У дакуменце гаворыцца, што гэтай платформы «беларуская дэмакратыя мае намер чыстасардэчна прытрымлівацца пасля аднаўлення ў Беларусі канстытуцыйнага ладу». Беларуская апазіцыя абяцае будаваць двухбаковыя адносіны на ўзаемнай павазе суверэнітэту Беларусі і Расіі: «не ўдзельнічаць у варожых Расіі міжнародных арганізацыях, саюзах ці аб'яднаннях трэціх дзяржаваў»; «Беларусь і Расія ствараюць найбольш спрыяльныя ўмовы — праваўныя, арганізацыйныя, маральна-палітычныя, для ўзаемадзеяння гаспадарчых структураў, свабоднага тавараабароту, абароту паслугаў капіталаў, працоўнай сілы, тэхналогіі»...

Зрэшты, усе прапануемыя прынцыпы прыводзіць няма сэнсу. Лідэры палітычнай апазіцыі спадзяюцца, што «расійскія палітыкі пачуюць нас, супаставіць нашыя намеры з прапагандысцкімі трукамі і маніпуляцыямі цяперашніх уладароў, зробяць выбар на карысць узаемнай павагі і шчырай дружбы народаў суверэннай Беларусі і вялікай Расіі». ■

82 дэпутаты

Уладзімір ГЛОД

Прайшло паседжанне мандатнай камісіі Вярхоўнага Савета Беларусі 13-га склікання. Вярхоўны Савет фактычна не ведае свайго складу: дэ-юрэ ў яго на аднолькавых правах дагэтуль уваходзяць і тыя дэпутаты, якія прытрымліваюцца Канстытуцыі 1994 года, і тыя, што ўвайшлі ў Палату прадстаўнікоў, і тыя, што не звязаны ні з Вярхоўным Саветам, ні з Нацыянальным сходам, і нават тыя, каго ўжо няма ў жывых.

Выключыўшы са складу Вярхоўнага Савета дэпутатаў-«палатнікаў», дэпутатаў, якія займаюць пасады, несумяшчальныя са статусам парламентарыяў, і тых, што ўжо памерлі, мандатная камісія прыйшла да высновы, што на 1 верасня ў Вярхоўны Савет уваходзяць 82 дэпутаты. 54 з іх у пісьмовай форме ўжо пацвердзілі сваё жаданне працаваць у Вярхоўным Савеце. Такім чынам, кворум для прыняцця рашэнняў складае 42 галасы — палова ад 82 плюс 1 голас. ■

Зроблены першы крок да перамоваў

Але да вырашэння пытання пра доступ апазіцыі да дзяржаўных СМІ дыялог не пачнецца

Рыгор БУЯН

3 верасня апазіцыя і выканаўчая ўлада зрабілі першы крок насустрач запланаваным перамовам. У афіцыйным прэс-рэлізе, разасланым па сродках масавай інфармацыі, называюцца асобы, якія прынялі ўдзел у сустрэчы з абодвух бакоў. Ад імя ўлады на сустрэчы выступалі памочнік прэзідэнта Міхаіл Сазонаў, дырэктар Інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў пры адміністрацыі прэзідэнта Яўген Матусевіч і юрыст адміністрацыі Алена Шніткова. У апазіцыйную групу экспертаў, якую ўзначальваў кіраўнік Цэнтра юрыдычнай дапамогі журналістам пры БАЖ Міхаіл Пастухоў, уваходзілі Юрый Тапарашаў, Уладзімір Нісцюк і Уладзімір Глод. У сустрэчы ў якасці наглядальніка ўдзельнічаў і прадстаўнік Ліберальна-дэмакратычнай партыі Аляксандр Рабатай, у якасці пасрэдніка выступіў кіраўнік КНГ АБСЕ Ханс-Георг Вік. Апазіцыя і місія АБСЕ перадалі ўрадаваму боку свае прапановы па доступе да СМІ. Наступная сустрэча экспертаў адбудзецца 8 верасня. Вось такая інфармацыя ўтрымліваецца ў прэс-рэлізе.

Кіраўнік апазіцыйнай групы экспертаў Міхаіл Пастухоў па просьбе НАВІНАЎ праясніў сітуацыю. Аказваецца, сустрэча 3 верасня не была сустрэчай экспертаў, здольных вырашыць праблему «доступу апазіцыі да дзяржаўных СМІ у час працэсу падрыхтоўкі перамоваў паміж урадам і апазіцыяй па пытанні свабодных, справядлівых, прызнаваемых міжнароднай супольнасцю выбараў». Эксперты сустрэнуцца 8 верасня, прычым схема прадстаўніцтва застанецца ранейшай: «4 + 4». Апазіцыя прадставіць экспертную групу ў ранейшым складзе; з боку ўладаў весці кансультацыі, акрамя Яўгена Матусевіча і Алены Шніцковай, хутчэй за ўсё, будуць яшчэ і прадстаўнікі Нацыянальнай дзяржтэлерадыёкампаніі і Дзяржкамітэта па друку. 8 верасня, як адзначыў М.Пастухоў, «будуць разгледжаны тры дакументы, і мы паспрабуем знайсці кансенсус» па допуску апазіцыі да СМІ. У гэтым выпадку выніковы дакумент будзе перададзены на разгляд і зацвярджэнне бакоў, а папярэднія кансультацыі аб доступе да СМІ могуць быць завершаны. Міхаіл Пастухоў не выключае, што апазіцыя да пачатку паўнацэнных перамоваў можа вылучыць яшчэ шэраг патрабаванняў, у прыватнасці, вызваліць усіх палітзняволеных — і Міхаіла Чыгіра ў тым ліку. Але без станоўчага вырашэння пытання аб доступе апазіцыі да дзяржаўных СМІ не можа быць нават гаворкі пра пачатак дыялогу.

Асноўныя патрабаванні апазіцыі, перададзеныя 3 верасня ўрадаваму боку, заключаюцца ў наступным. Палітычная апазіцыя патрабуе вылучэння сваім прадстаўнікам у цэнтральным друку плошчу не менш за 15 тысяч знакаў у два тыдні, гэтулькі ж — і ў рэгіянальным друку, каб мець магчымасць даводзіць да людзей сваю пазіцыю. Непасрэдна перад перамовамі апазіцыя просіць прамога эфіру для прадстаўнікоў палітычных партыяў — таксама для выкладання ўласных пазіцыяў. Так што ўладзе ёсць над чым паламаць галаву.

Зрэшты, нават пры самым спрыяльным ходзе кансультацыяў цяжка прагназаваць іх вынікі. Справа ў тым, што 8 верасня ў Мінску чакаецца паседжанне выканкама Саюза Беларусі і Расіі. А апазіцыя, па прапанове БНФ, патрабуе спыніць усе дзеянні, накіраваныя на ліквідацыю суверэнітэту Беларусі. ■

ЦЫТАТА НУМАРА

Все будет зависеть от того, какая команда придет к власти. Если у нас совпадут взгляды, если у них будет интерес продолжать работу с тем составом, который сейчас работает на телевидении, то думаю, что не только я, но и значительная часть сотрудников останется здесь работать.

Александр ЗИМОВСКИЙ
«Белорусская газета», 6 сентября 1999г.

Смог над Наваполацкам

Мікола ВАЙТОВІЧ

Учора над Наваполацкам вісеў моцны смог. Па гэтай прычыне ў 14 школах горада былі адменены заняткі, а дзіцячыя садкі зачыніліся. Да 9 гадзінаў раніцы не хадзіў гарадскі транспарт, на дарогах пачасціліся аварыі, а людзі проста задыхаліся ад дыму. Як паведамілі ў штабе грамадзянскай абароны, Наваполацк завалакло дымам з-за моцных пажараў на тарфяніках. Гэтыя пажары распачаліся ў суботу ў ваколіцах Наваполацка і Полацка, было зафіксавана каля чатырох ачагоў на плошчы каля 11 гектараў.

Спецыялісты мяркуюць, што ўзгаранне тарфянікаў адбылося па віне паляўнічых, якія накіраваліся за дабычай у наваколльныя лясы. ■

Вадзім Лабковіч ажаніўся

Алесь ШМЯЛЁЎ

4 верасня ўступіў у шлюб адзін з найбольш вядомых беларускіх палітзняволеных. У свой час 16-гадовы школьнік Вадзім Лабковіч быў арыштаваны за антыпрэзідэнцкія графіці і 6 месяцаў правёў у следчых ізалятарах. Пасля вызвалення Лабковіч стаў студэнтам і ўжо ў Інстытуце сучасных ведаў сустрэў сваю будучую жонку Юлію Бярозу (цяпер Лабковіч).

Сведкамі на рэгістрацыі Вадзіма і Юлі былі маладафронтаўцы, а адбылася яна зранку ў ЗАГСе Цэнтральнага раёна, што ў Траецкім прадмесці. Там жа, у адным з бараў адбылося ўрачыстае распіццё піва, пасля чаго маладыя паехалі да бацькоў, каб працягнуць святкаванне ўжо там. ■

СПОРТ

За сцяг — кулаком па шыі

Аляксей ШЫДЛОЎСКІ

Перад адборачным матчам чэмпіянату Еўропы па футболе паміж зборнымі Беларусі і Уэльса ўлады прынялі павышаныя меры бяспекі. Стала гэта вынікам бойкі, якая адбылася на трыбунах стадыёна «Дынама» падчас таварыскага матча Беларусь — Расія. Ужо за некалькі гадзінаў да гульні міліцыянты падыходзілі да шапікаў і забаранялі гандлярам прадаваць піва і іншыя напоі, якія мелі ў сабе хаця б нейкі градус. Пры падыходах да стадыёна ўсіх, крыху выпіўшых, адлоўлівалі і адводзілі далей ад спартыўнай арэны. Падчас самой гульні вельмі жорстка пераследвалі тых, хто імкнуўся падтрымаць нашую каманду бел-чырвонабелым сцягам. Уладзіміра Кавалеўскага, які прыйшоў на гульню з сынам і жонкай, калі ён дастаў сцяг, схапілі чацвёра спецназаўцаў, стукнулі па шыі і па прыступках павалаклі наверх. Там у яго адабралі сцяг, запісалі прозвішча, і толькі дзякуючы таму, што за Уладзіміра заступілася сям'я, яму дазволілі вярнуцца на матч.

У самой жа гульні нічога нечаканага не здарылася. Беларусам, як заўсёды, не шанцавала, што вылілася ў чарговую параззу з лікам 1:2. Адзіны гол нашай каманды забіў Васіль Баранаў. ■

ПАЛІТЫЧНАЯ АФІША

Акцыі ў гонар 8 верасня

Аляксей ШЫДЛОЎСКІ

Дзень Беларускай вайсковай славы, які традыцыйна святкуецца нацыянальна свядомымі беларусамі 8 верасня ў гонар перамогі войскаў Вялікага Княства Літоўскага над расійскім войскам у 1514 годзе пад Оршай, у гэтым годзе аб'яднаў вакол сябе адразу некалькі палітычных акцыяў.

У сераду, 8 верасня, у 17:30 Беларускі Народны Фронт на плошчы ля Опернага тэатра збірае людзей, каб правесці традыцыйныя шэсце і мітынг. Гэтая акцыя дазволена для правядзення Мінгарвыканкамам, у адрозненне ад «шоу», якое мусіць адбыцца сёння, 7 верасня, каля 19:00 ля помніка імя Янкі Купалы. Ва ўсякім разе так напісана на прыгожых каляровых улётках, якія з'явіліся ў Мінску апошнімі днямі. Акцыя, якая носіць назву «Мы разбілі маскалёў», арганізаваная Беларускай партыяй Свабоды, якая апошнім часам узнавіла сваю актыўную дзейнасць з відавочнай мэтай заняць пустуючае праварадыкальнае крыло на палітычным небасхіле. Паводле словаў прадстаўніка БПС, у несанкцыянаваНай акцыі возьмуць удзел паэт Славамір Адамовіч, бард Зміцер Бартосік і мастак Алесь Пушкін. ■

Пад грыфам «Звышсакрэтна»

Заканчэнне. Пач. на стар. 1

Дарэчы, немцам у «плане Латыпава» ўвогуле надаецца вялікая ўвага. Каб гэта не была пустая заява, варта цалкам працытаваць пункт 13. «Выкарыстоўваючы сяброўскія адносіны Х.-Г.Віка і прэзідэнта «Германа-беларускага дома Карлсруэ-Мінск» Р.-Д.Руперта з прадстаўніком Германіі ў Савеце Еўропы Н.Домесам, прадстаўніку РБ у Страсбургу усталяваць з апошнім цесны кантакт для садзейнічання фарміраванню ў арганізацыі пазітыўнага ўспрымання працэсаў і вынікаў унутрыбеларускага дыялогу». Пакінем на сумленні аўтараў гэтага дакумента іх яўна шпіёнскую фразеалогію («усталяваць цесны кантакт»), а таксама не заўважым парадаў выкарыстоўваць чыюсьці дружбу ў сваіх інтарэсах. Хай кантактуюць. Зазірнем лепш у сутнасць гэтага пункта.

А яна ў тым, што, яшчэ не ведаючы, як будзе складвацца «ўнутрыбеларускі» дыялог, тым больш не маючы прадстаўлення пра яго вынікі, аўтары плана ўжо загадваюць сваім падначаленым у Страсбургу "арганізаваць" прыём гэтых вынікаў на «ура». Хіба гэта не дэманстрацыя, што на самой справе галоўнае — для афіцыйнага боку. Зразумела, калі нашыя ўлады сапраўды збіраліся б выканаць умовы Еўропы — дэмакратызаваць палітычнае жыццё ў краіне і правесці сапраўды вольныя выбары, — інструкцыі спадара Латыпава наконт «арганізаваць пазітыўнае ўспрыняцце» ў прынцыпе не спатрэбіліся б.

І напрыканцы яшчэ адна красамоўная цытата: пункт 18 таго ж плана.

«Падрыхтаваць і перадаць рабочай групе пералік праблемных пытанняў у эканамічных адносінах РБ з краінамі-сябрамі ЕС, пазітыўнае рашэнне якіх тармозіцца з-за негатыўных знешніх адзнак палітычнай сітуацыі ў Беларусі, з мэтай давядзення гэтай інфармацыі да ведама палітычных партыяў і грамадскіх аб'яднанняў. Паралельна з рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання ўздзел апошніх у рашэнні гэтых праблемаў, а не заклікі да эканамічнай ізаляцыі Беларусі, будуць садзейнічаць эканамічнай стабілізацыі ў краіне».

Цытата — проста клас! З яе бачна, па-першае, што беларускім уладам патрэбны не Савет Еўропы, а яе грошы, без якіх нашым начальнікам ужо не пратрымацца. А па-другое, мімаходзь Латыпаў прызнае, што стабілізацыі ў нас насамрэч ніякай няма, калі дзеля яе даводзіцца слацца перад Еўропай і апазіцыяй. ■

КАНФЕСІІ

Царкоўны бізнес зноў у прывілеяваным становішчы

Алесь КНЯЗЮК, Марат ГАРАВЫ

У рад унёс змяненні ў Парадак кампенсацыі Дэпартаменту знешніх сувязяў Беларускага экзархата Праваслаўнай царквы сумаў падаткаў, мытных пошлінаў, іншых збораў і плацяжоў у бюджэт і ў дзяржаўныя пазабюджэтныя фонды. Зацверджаны гэты парадак быў у ліпені 1997 года. Асноўныя змяненні закранулі размеркаванне сумы кампенсацыі. Зараз Дэпартаменту знешніх сувязяў Беларускага экзархата Праваслаўнай царквы на будаўніцтва мемарыяльнага комплексу «Храм-помнік у гонар усіх Святых і бязвінна забітых у Айчыне нашай», Дома міласэрнасці і духоўна-адукацыйнага цэнтра будзе накіроўвацца не менш за 35 працэнтаў гэтых сумаў. Астатняя іх частка размяркоўваецца наступным чынам: «на ўтрыманне Дэпартамента — не больш за 5 працэнтаў, суб'ектам гаспадарання, якія рэалізуюць набытыя ў Дэпартамента тавары, — не больш за 5 працэнтаў, у пазабюджэтны фонд — не больш за 35 працэнтаў, у рэспубліканскі бюджэт — не менш за 20 працэнтаў дадзеных сумаў».

Дэпартамент знешніх сувязяў Беларускага экзархата павінен да 10 числа кожнага месяца прадстаўляць у Камітэт дзяржаўнага кантролю выпіску з асобных банкаўскіх рахункаў, на якія ідуць сумы кампенсацыі, і справаздачу аб выкарыстанні гэтых сродкаў.

Варта адзначыць, што кампенсацыя сумаў падаткаў, мытных пошлінаў, іншых збораў і плацяжоў у бюджэт і ў дзяржаўныя пазабюджэтныя фонды не з'яўляецца звычайнай практыкай у Беларусі. Іншыя рэлігійныя канфесіі, што дзейнічаюць у краіне, не могуць пахваліцца такімі льготнымі ўмовамі гаспадарання. ■

СУДОВЫ ПРАЦЭС

Феміда ў пастцы

Алесь ДАШЧЫНСКІ

У чацвер Фрунзенскі райсуд Мінска збіраецца вынесці прысуд былому старшыні праўлення Ашчаднага банка Рэспублікі Беларусь Уладзіміру Хілько. Пракурор палічыў неабходным даць банкіру пяць гадоў пазбаўлення волі.

У той жа час пракурор папрасіў улічыць прафесійныя заслугі, станоўчыя характарыстыкі, а таксама стан здароўя падсуднага. Сам Уладзімір Хілько сваёй віны не прызнаў. Падчас апошняга паседжання з-за моцнага прыступу радыкуліту яго збіраліся пакласці на лячэнне ў неўралогію. У.Хілько ледзьве падняўся ў залу суда і папрасіў усё ж працягваць працэс. Да гэтага часу У.Хілько знаходзіцца ў турэмнай бальніцы.

Абаронцы У.Хілько лічаць яго абсалютна невінаватым і спадзяюцца на апраўдальны прыгавор. Яны лічаць, што ў дзеяннях былога банкіра «няма складу злачынства, а таксама няма ўрону, быццам бы нанесенага краіне».

Пры гэтым патрэбна ўлічыць вялікую неразбярыху ў банкаўскім заканадаўстве нашай краіны, якая панавала падчас дзейнасці У.Хілько на сваёй пасадзе старшыні.

Па словах адваката Святланы Маргулец, у 13-томнай справе толькі тры тамы ахопліваюць дзеянні У.Хілько, а астатнія складаюцца з ксеракопіяў дакументаў, якія датычаць асобаў расійскага і латвійскага банкаў.

С.Маргулец лічыць, што абвінавачванне абсалютна надуманае, а ў дзеяннях былога старшыні Ашчаднага банка адсутнічае склад злачынства, і пра гэта сведчаць матэрыялы папярэдняга і судовага следства. Расійскі банк «Янтарь» і латвійскі «Латвін Трэйд банк», якія былі аб'яўленыя банкрутамі, не паведамлялі, што не вернуць узятыя крэдыты. Агульнапрынята, што ўсе банкі прадугледжваюць сродкі ў спецыяльны рэзервны фонд на выпадак банкруцтва. І да гэтага часу Нацыянальныя банкі Расіі і Латвіі не далі афіцыйнай адмовы ў вяртанні гэтых крэдытаў. Толькі пасля таго як Нацбанкі паведамяць, што не могуць вярнуць крэдыты, можна будзе гаварыць пра нейкі ўрон. У выпадку, калі, напрыклад, праз год Нацбанкі вернуць узятыя крэдыты, як тады быць з Уладзімірам Хілько? ■


Фота REX/ProMedia

● Лекарка правярае стан **Уладзіміра Хілько** за кратамі на лаве падсудных

ДЫЯГНАЗ

Интегранцы


Александр ПОТУПА

Что у нас по-настоящему здорово — наличествующие во всякий момент две новости. Одна непременно плохая, другая хорошая. Или наоборот — хорошая и плохая. А ввиду окончательно победившего *единосвободомыслия* каждый волен понимать, как пожелает — в любом порядке, установленном действующим президентом и действующим законом. Например, *жить будем тяжело, но недолго*. Тут не так-то просто сказать, какая из новостей плохая, — обе они по-своему хороши.

Или величайшая пара прочно склеенных новостей. Хорошая: *мы живем в Союзе с братской Россией*. Плохая: *определенные круги препятствуют нашему завершающему слиянию в единое сверхмощное государство*. Можно и наоборот, ежели нравится. Но каковы упомянутые *определенные круги*! И что же тогда думать об *определенных квадратах и шестиугольниках*, которые, как известно, спят и видят, поскольку есть отпетые агенты НАТО, МОССАДА и Уолл-Стрита одновременно?

Кое-кому очень хочется равноправнейшего Союза между странами, население коих разнится в 14,7 раза, ВВП — в 20 раз, а территория — в 82 раза. И кое-кто удивляется, что партнер к такому равноправию не готов. Кое-кто, будучи истинным диалектиком ленинского типа, считает, что должна быть как бы одна сверхдержава, которая на самом деле будет состоять из двух вполне суверенных государств. Чтоб они нам — ресурсы по внутренним ценам плюс ежегодное списание всех долгов, ибо какие там долги между братьями. А мы им — защиту западных границ с применением суперсовременного видеооружия в особо опасной форме *телеистерических* антиНАТОвских выпадов, благо на оные границы никто не покушается. А они нам — надежное прикрытие восточных рубежей, что как раз существенно.

Потому как, ежели группа российских пацанов с игрушечными автоматами под руководством нескольких «отмороженных» инструкторов запросто берет белорусскую деревню, то что же будет при прорыве сюда пары басаевских взводов? Дагестанская война уже обошлась братской России в годовой белорусский бюджет. Не прошло и трех недель, как выяснилось, что все великодержавные внутренние войска не могут справиться с несколькими сотнями моджахедов. Теперь в бой пошла регулярная российская армия, а сражения приближаются к Каспию. Может пора поворачиваться лицом к ваххабитам и пятикратно творить намаз? Стоит подумать — за такой нашенский государственный флаг они могут запросто в имамы произвести, а заодно прикупить десяток местных МАЗов и тракторов «Беларусь».

Но, несмотря ни на что *брачный танец пустого живота* продолжается. Получается не шибко эстетично, но доходчиво. Однако великая братская страна, беременная ускоренным развалом, занята чем-то своим исконно загадочным и на призыв нежный и страстный не реагирует. Упивается очередными двумя новостями. Солдатам, идущим на смерть в горах Дагестана, обещанные зарплаты по 1.000 баксов так и не выплачены. Но в супперремонт Большого Кремлевского дворца вбухано треть миллиарда долларов. Отгадайте с трех попыток, какая новость хорошая, а какая не очень. И да здравствуют *танцы-шманцы-интегранцы*! ■

ЭКАНОМІКА

«Чаўночны» бунт

Заканчэнне. Пачатак на стар. 1

Аднак і ў працэсе аб'яднання прадпрымальнікаў не абышлося без скандалаў. Прафсаюз прадпрымальнікаў Мінска і Мінскай вобласці «Садружнасць» фактычна сабатуе рашэнне аб правядзенні агульнарэспубліканскай забастоўкі. Прафсаюзныя функцыянеры робяць усё, каб не дапусціць забастоўкі ў сталіцы. Тым самым «Садружнасць» парушыла дамоўленасць прадпрымальніцкіх прафсаюзаў распачаць усеагульную забастоўку пры з'яўленні першых фактаў канфіскацыі тавараў у гандляроў. 3 верасня на беларуска-расійскай мяжы паблізу Оршы ўлады спынілі мікрааўтобус з дзевяцію прадпрымальнікамі і канфіскавалі ў іх расійскія рублі — у іх не было дакументаў на набыццё расійскай валюты. Таму ў той жа дзень, 3 верасня, прадстаўнікі «Садружнасці» былі выведзеныя са складу стачкама.

«Штрэйкбрэхерам у нас не месца», — заявіў НАВІНАМ Валерый Леванеўскі.

Са свайго боку, намеснік старшыні прафсаюза «Садружнасць» Мая Сінайская сцвярджае: перш чым баставаць, трэба адпаведным чынам падрыхтавацца. Яна сказала НАВІНАМ наступнае: «Ёсць факты, калі праваахоўцы інцыдэнты паміж тымі, хто працуе, і тымі, хто працаваць не хоча». Па словах М.Сінайскай, у прафсаюзе няма інфармацыі пра тое, што ў кагосьці з прадпрымальнікаў па рэспубліцы ўжо канфіскавалі тавар, а значыць, трэба далучацца да перамоваў, «якія вядуцца на досыць высокім узроўні, каб дабіцца альбо адмены дэкрэта № 14, альбо прыпынення яго дзейнасці».

Аднак дзеянне дэкрэта ўжо прыпынілася. Выходзіць, што «Садружнасць» свядома наступае на адны і тыя граблі? Дарэчы, акрамя інцыдэнту у Оршы, 3 верасня АБЭП правёў рэйд і на рынку «Ждановічы» пад Мінскам. Як сцвярджае М.Сінайская, там былі канфіскаваныя каля 120 кг мяса ў людзей, якія не мелі аніякіх дакументаў на прадукцыю. ■

«Кино про волосатых» на площади Свободы

Илья КУЗНЕЦОВ

Поздно вечером 20 августа милиция учинила «охоту» в самом центре Минска — в скверике, что на площади Свободы. Те, кому, мягко говоря, не повезло, оказались в участке. Совершенно невинных людей избивали и унижали. «Охота» велась по принципу: брать только «волосатиков»! Я оказался одним из них...

Новый друг

В этот день, около половины двенадцатого вечера, мы со знакомым шли по улице Ленина от ресторана «МакДональдс» по направлению к площади Свободы. Навстречу вышагивал парень и невысокая девушка. Парень, на вид лет 25-30, был в джинсах, кожаной жилетке и с длинными черными волосами. Пара подошла к нам, и парень, дружелюбно протянув мне руку, сказал: «Привет, как дела?». Я его не узнал, однако это его ничуть не смутило, и он предложил пойти в сквер, где снимают «кино про волосатых». Мы с другом, конечно, не мечтали сняться в кино, но, будучи оба «волосатыми» (у нас обоих довольно длинные волосы), решили посмотреть, что происходит в сквере на площади Свободы. Сразу хочу сказать, что мы не завсегдатаи подобных мест. Работа не позволяет нам проводить много времени на «тусовках», поэтому все нам было в новинку.

Облава

В сквере было полно народу. Мы сели на первую попавшуюся скамейку, открыли по бутылке пива, я закурил сигарету. Сидим, болтаем, смотрим на собравшуюся публику. Минут через 10 возвращается наш новый знакомый и говорит: «А что это вы здесь сидите, пойдемте к нам!». Заинтересовавшись, мы решили подойти поближе к эпицентру этой странной «тусовки». С задней стороны площади Свободы, около дома номер 2 по улице Энгельса стояли несколько мотоциклов. Через минут десять мой друг говорит: «По-моему, пора отсюда уходить». В недоумении я спрашиваю его: «Почему?». Он говорит: «Посмотри назад».

К мотоциклам подъехал большой «Икарус», и из него вышли с десяток милиционеров, сотрудников ОМОНа и люди в штатском. Через минуту милиция и люди в штатском стали собирать всех, кто был в сквере, и отводить их к автобусу. К нам тоже подошел человек в форме и скомандовал: «Все к автобусу!» Мы недоумевая пошли. По дороге человек в форме скомандовал: «Руки за голову!». Это уже становилось интересным...

Возле автобуса последовала команда: «Руки на автобус, расставить ноги». Мы повиновались. Ревностный страж порядка посчитал, что этого будет недостаточно, и ударом ботинка по внутренней стороне моей стопы придал моим ногам нужное положение. То же самое было и с остальными. Затем начался обыск. Во время обыска людей постоянно унижали. Особенно муссировалась тема гомосексуалистов: «А ты, что с длинными волосами и серьгой в ухе, педик что ли?» – говорили милиционеры и ребята в штатском задержанным. Всего по парку насобирали уже человек 30.

У моего друга в кармане был паспорт, у меня — водительское удостоверение, но нашими документами никто не заинтересовался. Пока мы стояли, нам удалось шепотом перемолвиться словечком. Решили, что не будем унижаться и просить «добрых дяденек», чтобы нас отпустили, а пройдем всю эту процедуру до конца. Не в каждой же стране в конце XX века граждане могут поучаствовать в таком «шоу».

После обыска людей стали загонять в автобус со словами: «Шевелись, шевелись!». Через одного — пинками под зад.

После этого все три категории стражей порядка стали ходить по автобусу и «отфильтровывать» приглянувшихся им людей.

— Кто тут из Москвы? — прежде всего спросили они. Почему не из Праги или Вильнюса, подумал я. Вышли два человека.

— Кто тут еще профессора и академики?

— Я – музыкант, — послышался голос.


На чем играешь?

— На скрипке.

— Хорошо, — говорят, — нам музыканты нужны.

Нескольких человек «отпросили» стоявшие у автобуса девушки.

После «фильтрации» нас повезли. Напротив кинотеатра «Победа» к нам в автобус подсадили еще человек 10 с дискотеки. Всех вместе доставили в отделение охраны порядка Центрального РОВД, что на улице Интернациональной, 14.



Автобус

В автобусе с мягкими сиденьями люди начали переговариваться, пытаясь выяснить друг у друга, за что нас забрали. Это не понравилось милиции, и поступила команда: «Молчать, головы на колени!». Неповиновавшихся быстро пригнули взмахами дубинок. Тех, кто сидел на передних сиденьях, в том числе и нас с другом, пересадили назад, потому что спереди — привилегированные места для стражей порядка. Вместе с милицией и ребятами в штатском получился полный автобус. Сидя с пригнутыми к коленям головами, мы вдруг увидели, что вдоль автобуса прогуливается и мирно разговаривает наш «волосатый друг». Только теперь мы поняли, кто он такой и что за «кино про волосатых» снимают в сквере на площади Свободы! Один из задержанных пытался объяснить милиции: «Я тут в кино снимался, вон режиссер ходит, позовите его, он скажет», — показывая пальцем на нашего нового «друга».

Отделение

Высадили из автобуса. «Всем к стене! Руки на стену, ноги шире!» Человек 20 сразу отправили в РОВД: «Бегом в клетку!» Остальных, в том числе и нас, передвинули вдоль по стенке, не отрывая рук. Стоим под углом градусов 45 к земле, упершись руками в стенку и широко раздвинув ноги. Должен сказать, довольно неудобное положение. Сзади ходят стражи порядка всех мастей и издеваются: «Тут же вообще людей нет, один сброд», «Педики тут есть? Поднять руки!», «Голову не поднимать».

Дальше начинается самое интересное. Оставшихся у стенки людей по одному начинают загонять в «клетку». Первому говорят:

— Так, отжался 20 раз и бегом в клетку. Понял?

— Я не умею отжиматься.

Подходит еще один в штатском:

— Подожди-ка. Не умеешь отжиматься? На физкультуре не научили? Тогда присел 30 раз и 2 секунды — ты в клетке.

Парень приседает, побежал. За две секунды не успел. Стражи ему:

— Назад! Присел еще 10 раз и 2 секунды — ты в клетке.

На этот раз добежал. Таким образом приседали или отжимались несколько человек. Посоветовавшись с другом, мы решили, что ни приседать, ни отжиматься мы не будем, что поможет нам благополучно снять побои. Стоим, ждем своей очереди. Сзади слышен голос:

— Кто служил в армии, поднять руку.

Несколько человек, в том числе и мы, поднимают руки. Команда: «В клетку!». Уже позже я понял, что в армии существуют свои законы, и под конец службы солдата не могут заставить приседать, отжиматься, мыть туалеты или совершать другие действия, которые обязаны совершать «молодые бойцы». Видимо, по таким же «законам зоны» живут и в милиции, и ребята просто постыдились заставлять «стариков» отжиматься. А жаль.

Клетка

Пошли в РОВД искать клетку. По отделению ходят толпы народа: родители, милиция, ОМОН, люди в штатском с рациями. Все двери открыты и при желании можно сбежать. Я подхожу к одному из кабинетов и спрашиваю: «Где здесь клетка?» Мне говорят: «Вон там». Клетка — это маленькое помещение, битком набитое людьми, стоящими вплотную друг к другу. Я думаю, что было бы неплохо записать несколько фамилий людей, но не делаю этого, опасаясь, что среди них могут опять оказаться провокаторы. Да и меня могли точно так же принять за провокатора.

В это время мой друг спрашивает у одного из стражей: «На каком основании вы меня задержали? У меня есть документы». В ответ поступает объяснение, что сейчас проводится общегородская операция (?!), документам верить нельзя (?!?!), а вдруг, мол, документы у тебя в порядке, а ты – бандит и находишься в розыске.

В гостях у Золушки. Настоящее кино

В комнате, куда нас отправили после «отсидки» в клетке, составляются протоколы. Делается это следующим образом. Выясняется фамилия, имя, отчество и год рождения. Далее следует телефонный звонок: «Золушка, посмотри, пожалуйста, Петров Петр Петрович, 1917 года рождения». После нескольких минут ожидания человека либо отпускают, либо составляют протокол. Вероятно, в зависимости от точки зрения Золушки.

При мне капитан журил одного из задержанных: «Ну что ж ты пиво пьешь, хулиганишь?». В ответ подросток извинялся и рассказывал, что шел, мол, с дискотеки, купил бутылочку пивка... «Ну иди, подпиши, что пил пивко... И вот тут еще». Парень не читая подписывал все. После этого капитан обращался к стоящему в дверях стражу: «Отведи-ка этого, откатай ему пальчики, чтоб не пил пивко». Одному только капитану известно, что подписал этот парень, но его повели в соседнюю комнату, сняли отпечатки пальцев и... сняли на видеокамеру. Вот оно где кино-то про волосатых, понял я.

Пока я ждал своей очереди, в комнату вбежали две заплаканные женщины, видимо, мать и сестра одного из задержанных парней.

— Что ты натворил?!

— Я ничего не натворил, — говорит он, — а вот этот (показывает на стража в дверях) дал мне в рожу, и я ему этого не прощу.

— Замолчи, — кричали бедные женщины, — товарищ милиционер, отпустите его!

Дошла моя очередь. Фамилия! Имя! Отчество! Год рождения! Звонок Золушке. Я жду, раздумываю, по какому же критерию Золушка отбирает людей. Я ведь, так сказать, не привлекался, не замечен, не состоял. Через несколько минут человек в форме кладет трубку и... молча начинает составлять протокол. Место рождения, место работы, зарплата. Через несколько минут подзывает меня к столу и говорит:

— Вот тут и тут.

— Что, тут и тут?

— Подпиши, тут и тут.

— Я сначала прочитаю, а потом уже подпишу или не подпишу.

В разделе «Нарушение» что-то накорябано совершенно неразборчивым почерком.

— Вы мне прочитайте, что тут написано.

Он читает: «При задержании шатался из стороны в сторону, речь была невнятной».

— Подписывать это не буду, потому что я не шатался из стороны в сторону, во-первых, потому что не был пьян, во-вторых, и потому что сидел на скамейке. Речь у меня не могла быть невнятной, потому что при задержании я вообще ни с кем не разговаривал.

В ответ «блюститель закона» тыкает пальцем:

— Хорошо, подпиши вот здесь, что ознакомлен с протоколом.

Смотрю туда, куда он показывает пальцем. Там черным по белому написано: «Подпись нарушителя».

— За кого вы меня принимаете? — говорю я.

— Ладно, пиши объяснение.

Я написал, что с протоколом не согласен, после чего был отправлен «к начальнику». Это была именно та комната, где «откатывают пальчики» и «снимают кино».

Меня попросили подождать в коридоре. Постоял минут 10, после чего ко мне подошел капитан и спросил: «На тебя протокол составляли?» — «Да» — «Свободен» — «Но я же не подписал протокол» — «Все равно свободен»

Вот так неожиданно я оказался на свободе. И, видимо, благодаря тому, что не подписал протокол. Власти боятся связываться с теми, кто оказывает им хоть малейшее сопротивление.

На основании данного факта я направил заявление в Хельсинкский комитет, правозащитный центр «Весна-96», другие международные правозащитные организации, «Хартию-97», ОБСЕ и ООН. Зачем? Я не хочу, чтобы мои дети боялись выходить на улицу, ведь подобные облавы стали обычным явлением. Например, на следующий день около 7 вечера в такой же автобус запихивали людей в районе парка им. Горького.

Предлагаю всем пострадавшим во время подобных рейдов обращаться в редакцию и в правозащитные организации Беларуси:

Правозащитный Центр «Весна-96». Тел/факс: 236-61-94

Беларуский Хельсинкский комитет. Тел/факс: 256-23-55

КАМЕНТАР НАВІНАЎ

Гэты матэрыял пра беззаконныя дзеянні міліцыянтаў прымушае ўспомніць даўнейшыя так званыя «Брыгады садзеяння міліцыі» (БСМ), якія фармаваліся з агрэсіўных добраахвотнікаў. Галоўным заняткам БСМ у 50-х гадах была барацьба з тагачаснай нестандартна апранутай моладдзю. Стандартам лічыліся «клёшы», і БСМаўцы, сустракаючы юнакоў у новамодных завужаных штанах, успорвалі іх па швах, а модныя «кокі» здымалі машынкай пад любы ім «бокс» ці пад «Катоўскага». Ёсць шмат людзей, якія памятаюць перажытыя тады ад канфармістаў здзекі і свае пачуцці абражанасці.

І сённяшняе паляванне міліцыі на «валасацікаў», кпіны, абразы, надуманыя пратаколы сведчаць пра вяртанне старых міліцэйскіх звычак выроўніваць па ранжыру. Варта заўважыць, што гэта не надта стасуецца з заявамі міністра УСРБ узняць аўтарытэт сваіх супрацоўнікаў у народзе. ■

© НАВІНЫ. Спасылка на газету НАВІНЫ абавязковая. Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў, публікаваць артыкулы дзеля палемікі. Адрас: г.Мінск, пр-т газеты «Известия», 8-173. Пасведчанне аб рэгістрацыі № 996
Выдаецца з 16 студзеня 1998 г. В.а. галоўнага рэдактара і заснавальнік Павел Жук. Выдавец – рэдакцыя газеты НАВІНЫ. Адрас для карэспандэнцыі: 220034, г. Мінск, вул. З.Бядулі, 6-47. Тэл./факс: 236-89-40.
E-mail: NPSvaboda@irex.minsk.by Надрукавана на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная зорка» (г.Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3) Заказ 594 Нумар падпісаны ў друк 06/09/99 (15:00) Наклад – 16.780